# 8 снежня адкрыецца літаратурна-дакументальная экспазіцыя «... І зноў на хвалі часу. Нязгасныя znічкі «Полымя»

07.12.2022 18:00

**У межах выставачна-асветніцкага праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры 8 снежня а 16-й гадзіне адкрыецца літаратурна-дакументальная экспазіцыя «... І зноў на хвалі часу. Нязгасныя знічкі «Полымя», прысвечаная стогадоваму юбілею дзяржаўнага літаратурна-мастацкага часопіса.**




Заснаваны ў снежні 1922, часопіс ва ўсе перыяды свайго развіцця быў дакладным адбіткам працэсаў, якія адбываліся ў айчыннай мастацкай літаратуры. Аўтары «Полымя» ў розныя дзесяцігоддзі — Цішка Гартны, Якуб Колас, Янка Купала, Кузьма Чорны, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Макар Паслядовіч, Раман Сабаленка, Эдуард Самуйлёнак, Ілля Гурскі, Вячаслаў Адамчык, Барыс Сачанка, Васіль Быкаў, Анатоль Вялюгін, Анатоль Грачанікаў, Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Уладзімір Караткевіч, пімен Панчанка, Кастусь Кірэенка, Генадзь Пашкоў, Алесь Бадак, Віктар Шніп...

На выстаўцы прадстаўлены даволі цікавыя матэрыялы — лісты, кнігі з аўтографамі, арыгіналы фотаздымкаў... Арганізатарамі ўсяго праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» выступаюць поруч з музеем Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура», рэдакцыя часопіса «Полымя», Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў, Нацыянальны гістарычны музей Беларусі, Музей беларускага кіно, нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм».

**Сяргей ШЫЧКО**

Навіны Папуля
09:35 Міністэрства ахо здароўя расказала аб новаўвядзеннях у апла работнікаў галіны
09:20 Краіны СНД акт супрацоўніцтва ў галіне інфармацыйнай бяспек
08:59 З пачатку года а токам паблізу энергааб загінула 13 беларусаў
08:31 Што вядома аб на футбольным стадыё будуецца ў Мінску
УСЕ НАВІНЫ